харчовага пытання істотна падрывала аўтарытэт Часовага ўрада, узмацняла сацыяльную напружанасць у беларускіх гарадах, на Паўночным і Заходнім фронтах і тым стварала глебу для чарговай рэвалюцыі.

Невыпадкова, што франтавікі, якія засталіся без прадуктаў, ужо пасля звяржэння Часовага ўрада, былі вымушаны шукаць іх у панскіх і нават хутарскіх гаспадарках. У выніку органам Савецкай улады давялося займацца вырашэннем харчовай праблемы ў яшчэ больш складаных умовах

УДК 331.556.4(476=430)«1918/1939»

В.У. Коваль, дац., канд. гіст. навук
(БГТУ, г. Минск)

## ХАРАКТАРЫСТЫКА АСНОЎНЫХ КІРУНКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў ГЕРМАНІІ (1918–1939 гг.)

Германія ў міжваенны перыяд стала адным з палітычных і эканамічных цэнтраў беларускай эміграцыі, куды перасяляліся жыхары Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. па 1939 г. уваходзіла ў склад Польшчы. Даследаванне беларускай міжваеннай дыяспары ў Германіі толькі пачынаецца, шмат якія аспекты засталіся пакуль па-за ўвагай гістарычнай супольнасці. Даследчыкі вывучаюць дзейнасць палітычных эмігрантаў у Берліне, абыходзячы эканамічныя працэсы.

У пачатку 1920-х гадоў на палітычнай арэне актыўна праявілі сябе прадстаўнікі дыпламатычнай місіі БНР, аднак пасля правядзення ІІ Усебеларускай канферэнцыі ў Берліне ў 1925 г. дзейнасць палітычных арганізацый у Германіі пайшла на спад. Большасць палітычных дзеячоў з ліку беларусаў пражывалі ў Берліне, некаторыя жылі ў Гамбургу, які стаў значным портам для беларусаў замежжа.

Беларускія эмігранты ў Германіі спрабавалі выступіць у ролі кансалідуючага цэнтра нацыянальнай дыяспары, аднак іх імкненне не было рэалізавана. З мэтай аб’яднання арганізацый замежжа ў 1932 г. у Берліне пачалі выдаваць беларускамоўную газету “Барацьба”. Рэдакцыя перыядычнага выдання мела шырокія кантакты з беларусамі ў розных краінах свету, таму на старонках газеты размяшчалася інфармацыя пра дзейнасць беларусаў у Францыі, Чэхаславакіі і нават Бразіліі.

Першы нумар “Барацьбы” пачынаецца артыкулам “Ад рэдакцыі”, дзе дакладна прагучала мэта беларускамоўнай газеты ў Берліне: “Нацыянальна-вызваленчая легальная прэса ўжо на працягу некалькіх гадоў здушана да шчэнту. ... балюча адчувае і беларуская эміграцыя ў

Эўропе і Амэрыцы адсутнасьць сваёй прэсы, якая-б асвятляла іх патрэбы, інфармавала-б іх пра нацыянальна-вызваленчую барацьбу іх братоў у Зах. Беларусі і стала-б для іх арганізуючым цэнтрам” [1]. Аналізуючы колькасць нумароў, ўплыў і папулярнасць выдання “Барацьба”, можна зрабіць выснову, што газета так і не стала кансалідуючым друкаваным органам беларусаў замежжа, аднак рэдакцыя слушна акрэсліла праблемы нацыянальнай дыяспары ў міжваенны перыяд. Слаба распрацаванай і малавядомай старонкай айчыннай гісторыя з’яўляецца дзейнасць беларускіх студэнтаў у Германіі, якія змаглі гучна заявіць пра нацыянальныя арганізацыі і суполкі на міжнародным узроўні. Гістарычнай крыніцай па тэме з’яўляецца віленская прэса міжваеннага часу, на старонках якой засталіся звесткі пра мерапрыемствы беларускага студэнцтва ў Берліне.

Віленская газета “Родны край”, якая была органам Таварыства беларускай асветы, у 1933 г. апублікавала матэрыял пад назвай “Студэнцкая арганізацыя”. Інфармацыйны матэрыял падкрэлівае: “Як інформуе Бюлетэнь АБСА, у Бэрліне даўжэйшы ўжо час існаваў гурток беларускіх студэнтаў, які ў 1932-33 акад. годзе рэарганізаваўся у Саюз Беларускіх Студэнтаў у Нямеччыне” [2]. Матэрыял дэманструе кантакты беларускіх студэнтаў у Германіі са студэнцтвам ў Чэхаславакіі, бо АБСА (Аб’яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый) – гэта адна з найбольш уплывовых і аўтарытэтных арганізацый беларусаў у Празе. На старонках сваёго друкаванага органа АБСА папулярызавала дзейнасць гуртка беларускіх студэнтаў у Берліне, што сведчыць пра ўзаемакантакты паміж арганізацыямі.

Газета “Родны край” таксама пераконвала чытачоў, што Саюз беларускіх студэнтаў у Германіі меў вопыт удзелу ў міжнародных праектах: “СБС зьяўляецца чынным сябрам Цэнтральнага Саюзу Загранічных Студэнтаў у Нямеччыне”[2]. Для беларускай дыяспары было важна заявіць сваю нацыянальную прысутнасць у міжнародных арганізацыях, таму студэнты імкнуліся ўдзельнічаць у кангрэсах і канферэнцыях, дасылаць сваіх дэлегатаў на чарговыя мерапрыемствы. Найбольш актыўнымі ў 1920–1930-я гг. былі беларускія студэнты ў Чэхаславакіі, Італіі, якія падтрымлівалі беларусаў у Германіі.

У міжваенны перыяд Польшча была сельскагаспадарчай краінай з перанаселенымі вёскамі. У Заходняй Беларусі востра стаяла праблема беззямелля, таму сяляне актыўна ўдзельнічалі ў праграмах сезонных работ за мяжой. Дзяржаўныя органы мелі магчымасць пераразмяркоўваць працоўныя месцы ў Германіі паміж ваяводствамі, што дазваляла стрымаць эміграцыйную хвалю з тэрыторыі Заходняй Беларусі, каб знізіць канкурэнцыю для палякаў.

Пераважную колькасць беларусаў у Германію польскія ўлады накіравалі з Беластоцкага ваяводства. З 1926 г. па 1938 г. туды было адпраўлена 8.062 чал [3]. Аснову эканамічнай эміграцыі ў Германію складалі сезонныя сельскагаспадарчыя рабочыя, якія выязжалі на заробкі ў пачатку вясны і вярталіся на радзіму толькі восенню. У вызначаны перыяд (з 1926 па 1938 гг.) з Віленскага ваяводства было адпраўлена ў Германію толькі 28 чал., з Навагрудскага – 152 чал., з Палескага – 5 чал. [3]. У той жа час спрыяльныя ўмовы для заробкаў былі створаны для этнічна польскіх ваяводстваў, што дэманструе дыскрымінацыйную палітыку польскіх улад. Дзяржаўныя эміграцыйныя органы мэтанакіравана пашыралі ў Заходняй Беларусі міжкантынентальную эміграцыю, калі сем'і фактычна гублялі магчымасць вярнуцца. Такая палітыка была ніравана на памяшэнне колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, што дазваляла больш эфектыўна праводзіць паланізацыю "усходніх крэсаў".

Пашырэнне хвалі сезоннай эміграцыі вымусіла ўлады 24 лістапада 1927 г. падпісаць міжурадавы дакумент "Канвенцыю аб дзейнасці польскіх сельскагаспадарчых работнікаў" [4, с. 348], які рэгуляваў юрыдычныя аспекты арганізацыі эміграцыйнага руху. Канвенцыя падкрэслівала, што эміграцыя з Польшчы павінна мець выключна сезонны характар. У дакуменце былі прапісаны дэталі рэпатрыяцыі польскіх грамадзян, умовы і правілы рэкрутацыі сялян, правы і абавязкі эмігрантаў.

Пасля прыходу да ўлады ў Германіі нацыянал-сацыялістаў рэзка зменшылася хваля сезоннай эміграцыі, у мэтах барацьбы з беспрацоўем змяніліся ўмовы пражывання і працы ў сельскай мясцовасці. Фактычна з сярэдзіны 1930-х гг. сезонная эміграцыя была зведзена да мінімуму, а патрэба ў дадатковай замежнай рабочай сіле знікла. Такім чынам, беларуская дыяспара ў Германіі была прадстаўлена як палітычнымі, так і эканамічнымі эмігрантамі. Паспяховай міжнароднай дзейнасцю вылучыліся беларускія студэнцкія арганізацыі ў Берліне, якія падтрымлівалі цесныя кантакты з беларускім студэнцтвам Чэхаславакіі. Эканамічная эміграцыйная хваля з тэрыторыі Заходняй Беларусі мела сезонны характар, польскія ўлады мэтанакіравана стрымлівалі маштабы эміграцыі беларусаў, каб знізіць канкурэнцыю для сялянам-палякаў.

ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ. – Фонд 458. – Воп. 1. – Спр. 182. – Л. 1.
2. Студэнцкая арганізацыя // Родны край. – 1933. – № 15. – С. 6.
3. Archiwum Akt Nowych. – Fund "Ministerstwo Spraw Zewnętrznych". – Sygn. 9886. – Str. 145.

4. Janowska, H. Emigracja z Polski w latach 1918–1939 / H. Janowska // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX w.). – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. – S. 326–450.

УДК 323.2: [008 + 338.46] (476)

Н.М. Якуш, доц., канд. ист. наук
(БГТУ, г. Минск)

## ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПОЛИТИКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ОБЛАСТИ КУЛЬТУРЫ И РАЗВИТИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО ТУРИЗМА

Каждое суверенное государство в современном мире проводит национальную политику в сфере культуры. При этом роль государства состоит в гармонизации элитарной, народной и массовой культур, упрочении культурно-духовных начал нации как базы сохранения идентичности.

Опираясь на принципы приоритета общечеловеческих ценностей и национальных интересов, Республика Беларусь реализует свою стратегию развития, охраны и репрезентации историко-культурного наследия по следующим основным направлениям: - включение культурного наследия в социальную коммуникацию; - создание современного культурного креативного пространства; - налаживание активного диалога, культурного обмена и культурных контактов с другими народами; – проведение высокопрофессиональной интерпретации пластов традиционной культуры и ее актуализация современными средствами; - отражение реального многообразия образцов национальной культуры в институтах современных средств массовой коммуникации. Эти направления получили закрепление в Кодексе Республики Беларусь о культуре, который установил правовые, организационные, экономические и социальные основы культурной деятельности.

Начиная с конца 1990-х гг., государственная политика в сфере культуры находит свое выражение в комплексных, профильных и специальных программах общественного развития. Наглядным подтверждением культурных приоритетов являются проводимые в стране международные и национальные фестивали и конкурсы, мероприятия республиканского масштаба, связанные с празднованием дня белорусской письменности, юбилеев белорусских классиков Я. Купалы и Я. Коласа, года книги, определением по годам культурной столицы Беларуси и т. д.